Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛІПЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 136 (28246)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Выбраць ВНУ ў апошнія гадзіны

СТАР. 3



Мастак не павінен любіць сябе

СТАР. 9



Сапраўдныя і лжэпартызаны

СТАР. 11

# О, ФЕСТЫВАЛЬ, ТЫ — МІР!

**Мільёны гледачоў сачылі 14 ліпеня за тэлетрансляцыяй цырымоніі ўрачыстага адкрыцця XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Кіраўнік беларускай дзяржавы па добрай традыцыі на галоўнай сцэне «базару» павіншаваў удзельнікаў і гасцей культурнага праекта, якія не мае аналагаў.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Нягледзячы на работу, якая праводзіцца, трэба будзе яшчэ шмат зрабіць для ліквідацыі наступстваў неспрыяльных з'яў надвор'я і забяспечыць бяспечную жыццядзейнасць людзей. Неабходна задзейнічаць існуючыя рэзервы і сілы для аднаўлення ў першую чаргу жылога фонду там, дзе грамадзяне вымушаны пакінуць свае месцы або пражываць у складаных умовах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.07.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9828 ▼ |
| Еўра | 2,2086 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0313 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0799 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Па сутнасці справы

## СПАЗНАЦЬ СВЕТ І ЗАСТАЦЦА ЖЫВЫМ

**Свой самы першы ганарар мне давялося зарабіць у пяць гадоў. Самастойна пайшла на масавае свята, якое праходзіла ў кіламетры ад дома. Выразна прачытала вершык, за што і была ўзнагароджана каробкай цукерак «Рамонак». Цяпер паглядзіце на тую звычайную сітуацыю сённяшнімі вачыма: дзіця без бацькоў — ды ў натоўпе незнаёмых людзей, не факт, што цвярозых! Гэта ж трэба тэрмінова звяртацца ў міліцыю, а маці выклікаць на камісію па справах непаўналетніх.**



А яшчэ ў два-тры гады мяне штодзень пакідалі адну дома на некалькі гадзін: «дэкрэт» быў да пяці месяцаў, ясляў на ўсіх не хапала, а бацькі працавалі ў розныя змены. Мяне ніколі не вадзілі за руку ў школу і не забіралі адтуль. Мы забіраліся на дахі па пажарных лесвіцах, гулялі ў казакоў-разбойнікаў і хаваліся на будоўлях побач.

СТАР. 7

■ Прарыў у хірургіі

## «Я ЎДЗЯЧНЫ ЎСІМ МЕДЫКАМ!..»

Журналістам паказалі пацыента, якому паспяхова было праведзена першае ў свеце пратэзаванне трахеі з выкарыстаннем тканкаінжынернага пратэзу.

СТАР. 4



Фота БЕЛТА.

Пацыент, які перанёс аперацыю на трахеі, Анатоль Хлапкоў з урачамі Алегам Суконкам, Вольгай Алейнікавай і Уладзімірам Жарковым.